# УЗНАЧАЛІЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ І МАСАВА-ПАЛІТЫЧНУЮ РАБОТУ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

★

**Н. Я. НАТАЛЕВІЧ—**
**в. а. Старшыні ЦВК БССР**

★

Шырока разгарнулася кампанія па выбарах у Вярхоўны Совет Совецкай Социялістычнай Беларускай Рэспублікі. Арганізавана, паслядоўна ад аднаго этапа да другога выбарчая кампанія падыходзіць да самага адказнага моманту — да выбараў на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Працоўныя Совецкай Беларусі, згуртаваныя вакол слаўнай партыі Леніна — Сталіна, актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да выбараў свайго вышэйшага органа дзяржаўнай улады — совецкага парламента — Вярхоўнага Совета БССР. Па ўсіх прадпрыемствах, заводах і фабрыках, у калгасах праходзяць прадвыбарчыя сходы і мітынгі. Першыя галасы беларускі народ аддасць мудраму правадыру, бацьку і другу беларускага народа вялікаму **Сталіну** і яго баявым саратнікам таварышам **Молатаву, Кагановічу, Варашылаву, Калініну, Андрэеву, Жданаву, Ежову, Мікаяну.**

З выключнай гордасцю і вялікай радасцю сустрэлі працоўныя Совецкай Беларусі вестку аб тым, што вялікі, мудры Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі далі сваю згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет БССР. Гэты вялікі гонар, найвялікшая ўвага і клопаты, якую заўсёды аказвалі і аказваюць урад і партыя і асабіста таварыш Сталін беларускаму народу, яшчэ больш узнялі палітычную актыўнасць працоўных мас у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Разгортваючы масавае соцыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух, кожны рабочы, кожны калгаснік, кожны працоўны імкнецца сваім абавязкам і гонарам прыйсці да дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР з найвялікшымі вытворчымі паказчыкамі. І той гістарычны факт, што таварыш Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі далі згоду балатыравацца ў Вярхоўны Совет нашай Беларускай рэспублікі, накладае на рэспубліканскія, абласныя і мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі адказнейшы абавязак.

На-жаль, дзе-ні-дзе кіраўнікі партыйных арганізацый, советаў забываюць аб гэтым і слаба кіруюць выбарчай кампаніяй на выбарчых участках.

Да гэтага часу вельмі дрэнна працуюць некаторыя Акруговыя выбарчыя камісіі. Многія старшыні Акруговых выбарчых камісій не ведаюць сапраўднага становішча работы на выбарчых участках, на ўчастках не бываюць і не кіруюць імі.

Чым можна вытлумачыць бяздзейнасць Дрыбінскай Акруговай выбарчай камісіі, Хоцімскай Акруговай выбарчай камісіі, дрэнную работу Прапойскай, Клімавіцкай, Чашніцкай, Езярышчанскай, Клічаўскай і Чавускай Акруговых выбарчых камісій, як не палітычнай бяспечнасцю і благадушшам старшынь адзначаных выбарчых камісій? Чым можна вытлумачыць такі факт, калі старшыня Аршанскай Акруговай чыгуначнай выбарчай камісіі Ракіцкі паехаў на курорт, нават не паставіўшы ў вядомасць аб гэтым райком партыі, як не палітычнай бяспечнасцю, безадказнасцю Ракіцкага. Яшчэ горш, што ніхто з райкомаў і гаркомаў партыі да гэтага часу вінаватых не прыцягнуў да партыйнай адказнасці. Некаторыя старшыні райвыканкомаў не аказваюць ніякай дапамогі Акруговым выбарчым камісіям, мала таго, усю адказнасць за становішча падрыхтоўчай работы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР па раёну перакладваюць на Акруговыя выбарчыя камісіі.

Старшыня Дрыбінскага райвы-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы